**Ражкова Л.Л.,**
*аспірантка кафедры народна-інструментальнай творчасці*

# ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ АСОБЫ Ў НАВУЧАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСЕ ГУРТКОЎ ФАЛЬКЛОРНАГА НАКІРУНКУ

Сёння праблема нацыянальнай самасвядомасці асэнсоўваецца з сучасных пазіцый. З аднаго боку, "усплёск" нацыянальнай самасвядомасці — своеасаблівы водгук на нацыянальную палітыку былога СССР. З другога — рост нацыянальнай самасвядомасці выступае як супрацьдзеянне духоўнай уніфікацыі чалавека ў выніку магутных інтэграцыйных працэсаў, якія назіраюцца ў сучасным свеце. Разуменне прычын, што стымулявалі рост праблемы, дае магчымасць шукаць шляхоў яе вырашэння.

Паспрабуем паказаць адзін са шматлікіх падыходаў да гэтай тэмы. Лічым: вопыт, назапашаны ў аматарскіх гуртах па выхаванні нацыянальнага ў чалавеку, належыць хаця б часткова перанесці на другія інстытуты сацыялізацыі асобы — у прыватнасці агульнаадукацыйную школу.

Працэс выхавання ў аматарскіх харавых гуртах складаецца з трох асноўных яго напрамкаў: музычна-эстэтычнага выхавання, музычна-тэарэтычнага і вакальна-тэхнічнага навучання. Выхаваўчая функцыя прысутнічае ў навучальна-выхаваўчым працэсе кожнага аматарскага калектыву. Ад прафесійнага такі калектыў адрозніваецца зместам прадметаў і характарам навучання. Так, навучанне ў аматарскіх гуртах мае комплексны характар. Большая частка тэарэтычных ведаў перадаецца выхаванцам непасрэдна ў ходзе працы над рэпертуарам і падмацоўваецца фактамі, звесткамі. Гэта спрыяе свядомаму і паглыбленаму засваенню матэрыялу.

Зразумела, працэс фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ў працы гурткоў фальклорнага накірунку

ідзе не “адкрыта”. Ён “схаваны” ад нашых вачэй, апасродкаваны; веды аб этнічным даюцца праз інфармацыю, неабходную менавіта для творчай дзейнасці гурту. Такім чынам, вырашаючы штодзённыя творчыя задачы, адначасова мы фарміруем нацыянальную самасвядомасць удзельнікаў гурту. Першы накірунак, музычна-эстэтычнае выхаванне, падаецца шматабяцальным з пункту гледжання фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы. У рамках гэтага накірунку патрабуецца праца па ўвядзенні дзіцяці, падлетка ў свет фальклорнай эстэтыкі не толькі з мэтай павышэння іх агульнай культуры, але і з мэтай пашырэння іх ведаў, развіцця мастацкага густу. Абрадавы і пазаабрадавы фальклор увогуле багаты і разнастайны, асабліва славесныя, музычныя, харэаграфічныя, драматычныя яго жанры.

Асобна трэба адзначыць кола каляндарна-абрадавых песень. Беларускія народныя валачобныя, жніўныя, восеньскія песні амаль што не маюць аналагаў у фальклоры іншых краін свету.

Вывучэнне песенных традыцый, жанравых, стылістычных асаблівасцей фальклору, прынцыпаў фальклорнай творчасці актыўна ўплывае на фарміраванне эстэтычнага светаўспрымання выканаўцаў, фарміруе адметны, уласцівы вуснай культурнай традыцыі склад музычнага мыслення.

Ён садзейнічае ўнутранаму ўсведамленню прыроды, асаблівасцей этнічнага слою культуры.

Трэба падкрэсліць: у песнях інфармацыя закладзена не толькі ў слове, але і ў музычным тэксце. Вось чаму на занятках па сальфеджыо (музычна-тэарэтычны накірунак) неабходна ўжываць якраз беларускі матэрыял. Апошні адлюстроўвае не толькі галоўныя гістарычныя падзеі, характар нацыі, яе светаадчуванне, але і асаблівасці нацыянальнага музычнага мыслення з уласцівымі яму ладавымі, меладычнымі, рытмічнымі структурамі.

Творчасць аматарскіх гуртоў фальклорнага накірунку цесна звязана з песняй, таму галоўным інструментам падобных гуртоў з’яўляецца спеўны голас. З гэтай прычыны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значная частка навучальна-выхаваўчага працэсу прыпадае на долю названага раздзела. У працэсе авалодвання вакальна-тэхнічнымі навыкамі ўдзельнікі гуртоў знаёмяцца са сродкамі музычнай выразнасці, прыёмамі пеўчага гукавядзення, тэмбравай афарбоўкай галасоў, дынамікай, уласцівымі народнай манеры спеваў нацыянальнымі тэхнічнымі асаблівасцямі. Вядома ж, што кожны этнас адрозніваецца ад астатніх манерай спеваў, стылем выканання, гукам, тэмбравай яго афарбоўкай, спецыфікай утварэння.

Перадача этнічных ведаў павінна абавязкова весціся ў сістэме параўнання "мы — яны". Атрымліваючы веды пра сваё ўласнае паходжанне, вучні мусяць атрымліваць інфармацыю пра іншыя этнасы, бо толькі ў параўнанні маем магчымасць усвядоміць свае спецыфічныя рысы. І, безумоўна, найбольш спрыяльны перыяд для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці асобы — 11—15 гадоў, перыяд фарміравання ўласнай самасвядомасці чалавека.

У гэтым узросце абуджаецца цікавасць да гісторыі свайго народа, да яго традыцый, абрадаў, а гэта дазваляе чалавеку самаідэнтыфікавацца ў нацыянальным асяроддзі. Нельга абысці ўвагай і папярэдні перыяд фарміравання гэтага віду самасвядомасці. Ён прыпадае на 6—10 гадоў, з'яўляецца плацдармам для будучага этнічнага ўсведамлення.

Напрыканцы хочацца падкрэсліць: праблема нацыянальнай самасвядомасці ў наш час стала вельмі актуальнай, яе трэба неадкладна вырашаць. Цяпер у школах, пазашкольных установах патрабуюцца і веды, і выхаваныя ў нацыянальным духу настаўнікі. Вышэйшыя навучальныя ўстановы з'яўляюцца адным са звёнаў ланцужка бесперапыннага навучання. Менавіта тут афармляецца канчаткова нацыянальная самасвядомасць асобы.

Таму вялікая адказнасць выпадае на долю Беларускага ўніверсітэта культуры. Дзеля таго каб маладыя спецыялісты ўмелі мэтанакіравана выхоўваць нацыяналь-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ную самасвядомасць удзельнікаў будучых самадзейных гуртоў, яны павінны быць нацыянальна свядомымі.

Планаванне і арганізацыя навучальна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце культуры дапамагаюць фарміраванню гэтага віду самасвядомасці ў студэнцкай моладзі. Праца ў такім накірунку прадугледжвае падбор зместу вучэбных праграм, шырокі выбар формаў, метадаў, сродкаў выхавання. Яна патрабуе вялікай работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці асобы.

**Кундзянок А.І.,**
*аспірантка кафедры харавога мастацтва*

## ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД ДА АСОБЫ Ў ПРАЦЭСЕ РАБОТЫ НАД ХАРАВЫМІ ТВОРАМІ

Адной з важнейшых задач усёй сістэмы музычнай адукацыі з'яўляецца фарміраванне духоўнага свету юнага музыканта, яго эстэтычных пачуццяў.

У Рэспубліцы Беларусь гэтаму пытанню ўдзяляецца вялікая ўвага: распрацоўваюцца праграмы па навучанні ігры на розных музычных інструментах, па харавых і вакальных спевах, пачынаючы з дашкольнага ўзросту. Адчыняюцца ўстановы новага тыпу, вядзецца бесперапынны пошук сродкаў і метадаў для інтэнсіўнага і прадуктыўнага навучання музыцы, для падрыхтоўкі сярэднімі і вышэйшымі ўстановамі высокапрафесійных спецыялістаў. Бо менавіта апошнія будуць весці вучэбна-выхаваўчую работу: фарміраваць погляды, перакананні, густы, ідэалы дзяцей. Выхоўваючы вучняў сродкамі музычнага мастацтва, такі спецыяліст абавязаны быць шырока адукаваным чалавекам, добрым музыкантам, асобай у высокім грамадскім значэнні слова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ